# РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

# ГІСТОРЫЯ ВЫДАВЕЦКАЙ СПРАВЫ Ў БЕЛАРУСІ

## Выдавецкая справа і перыядычныя выданні ў літоўскіх татар

*Ібрагім КАНАПАЦКІ, канд. гіст. навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя М.Танка*

Татар, што жывуць на землях Беларусі, а таксама суседніх Літвы і Польшчы, здаўна называюць літоўскімі. Гэта найменне нагадвае аб тым, што іх продкі з'явіліся тут у часы, калі назва "Літва" пашыралася на Вялікае Княства Літоўскае, а да Белай і Чорнай Русі дачыняліся яе асобныя правінцыі, землі. Паводле дамовы Вітаўта, кіраўніка Беларуска-Літоўскай дзяржавы, і хана Залатой Арды Тахтамыша, які жыў на выгнанні ў г. Ліда (1395—1397), напрыканцы 1397 г. некалькі тысяч татар з сем'ямі з Прычарнамор'я і Крымскага паўвострава пасяліліся каля Вільні, Навагрудка, Горадні.

Друкаваная літаратура літоўскіх татар пачала пашырацца толькі ў першай палавіне мінулага стагоддзя. У 1830 г. у Вільні ў прыватным выдавецтве пабачыла свет кніга Юсуфа Сабалеўскага, апеляцыйнага суддзі Навагрудскага павета, пад назвай "Изложение веры Мухаммеда, или Ислама. Взята из Кур'ана и указаний Пророка — хадисов". У 1858 г. упершыню быў выдадзены ў перакладзе на польскую мову Кур'ан у двух тамах, падрыхтаваны Я. Т. Бучацкім. У 1907 г. выйшаў на рускай мове Кур'ан, які пераклаў Г. С. Саблукоў (некалькі разоў перавыдаваўся, у 1990 г. таксама).

Выдавецкая справа ў літоўскіх татар пашырылася пасля Першай сусветнай вайны ў адроджанай Польскай Дзяржаве. Створаны ў Польшчы Звёнзэк Культурально - Освятовы Татарув Рэпублікі Польскі (ЗКОТРП) у 1929 г. надрукаваў Статут Згуртавання, Каталог Татарскага Народнага Музея і брашуру "З культурна-асветнага руху польскіх татар".

У 1929 г. выйшла ў свет праца Станіслава Дзядулевіча "Гэрбаж родзін татарскіх в Польсцэ" (Гербоўнік татарскіх сем'яў (фамілій) у Польшчы).

Як вялікае дасягненне польскіх навукоўцаў-татар і сяброў татарскага народа трэба лічыць тры штогоднікі, якія называліся "Рочнік татарскі". Першы штогоднік з'явіўся ў траўні 1932 г., прымеркаваны да Другога польскага арменталістычнага з'езда. Другі пазначаны 1935 годам, але да чытача дайшоў у пачатку 1936 г. Трэці штогоднік датаваны 1938 годам.

У Вільні пачалі друкавацца рэлігійныя дапаможнікі для татар. У 1926 г. выйшаў першы "Практычны дапаможнік навучання па-арабску". З 1929 г. на сродкі муфтэята сталі друкаваць мусульманскія календары, куды ўключаліся статыстычныя дадзеныя аб мусульманскіх краінах, мячэцях і мізарах у Польшчы, Літве і Беларусі, згадваліся падзеі з гісторыі татар, мусульман і г.д. У 1936 годзе выйшлі "Выпрымкі з Кур'ана", якія пераклаў на польскую мову Я.Шынкевіч (падаваўся тэкст і на арабскай мове), а таксама "Тэджвід" — падручнік па чытанні Кур'ана. У 1937 г. на ўласныя сродкі Мустафа Александровіч надрукаваў у Вільні "Кароткі нарыс рэлігіі іслам".

З пачаткам Другой сусветнай вайны татарскія выданні ў Польшчы спыніліся. Толькі ў 60—70-я гады татарскія арганізацыі і асобныя даследчыкі ў Польшчы зноў актывізаваліся.

На Беларусі ўсю работу па адраджэнні і захаванні самабытнага (паводле вызначэння ЮНЕСКА — рэліктавага) этнасу кардынуюць і накіроўваюць створаныя адпаведна ў 1991 і 1994 гг. Беларускае згуртаванне татараў-мусульман "Аль-Кітаб" і мусульманскае рэлігійнае аб'яднанне ў Рэспубліцы Беларусь.

Актывісты "Аль-Кітаба" з дапамогай сваіх сяброў-беларусаў выпусцілі пачынаючы з 1991 г. 20 нумароў квартальніка "Байрам" на беларускай мове.

З ліпеня 1994 г., з улікам пажаданняў некаторых чытачоў "Байрама" і мусульман з рэспублік былога СССР і далёкага замежжа, пачаў выходзіць штомесячны часопіс "Аль-Джыхад", што па-арабску значыць "Барацьба". Праўда, пад такой назвай выйшаў толькі адзін нумар, і ўжо з наступнага ён меў назву "Аль-Ислам", а з трынаццатага —"Жизнь". За гэты час выйшла 22 нумары часопіса на рускай мове. У 1994 г. убачыла свет кніжачка "Рамазан", прымеркаваная да пачатку свяшчэннага месяца мусульман — Рамазана. У гэтым жа годзе выйшаў тэматычны зборнік "Крымские татары.1944—1994 гг.", прысвечаны 50-годдзю трагедыі крымскіх татар. У 1996 г. муфтэят мусульманскага рэлігійнага аб'яднання ў Рэспубліцы Беларусь аднавіў выданне мусульманскага календара на Беларусі. Вядзецца работа над складаннем артыкулаў Энцыклапедыі для беларускіх татараў, якая будзе выдадзена на беларускай і іншых мовах.

Важнымі падзеямі на гэтыя гады былі Першая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы" (сакавік 1993 г.) і Другая міжнародная канферэнцыя "Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай ды іншымі культурамі" (травень 1995 г.), у рабоце якіх бралі ўдзел больш за сто вучоных з розных краін свету. Па выніках канферэнцый выйшла 5 кніжак. Трэцюю міжнародную канферэнцыю, прысвечаную вывучэнню і захаванню культурнай спадчыны татарскага народа на Беларусі, мяркуецца правесці ў першай палавіне 1997 г. у Беларускім універсітэце культуры. У гэтым часе пройдуць і ўрачыстасці, прысвечаныя 600-годдзю татарскага асадніцтва на землях Беларусі, Літвы і Польшчы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ